УДК 821.161.3-3.09(045)

І. А. Бурдзялёва
Установа адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, кафедра беларускай мовы і літаратуры

НАЦЫЯНАЛЬНАЕ І РЭГІЯНАЛЬНАЕ Ў РАМАНЕ ВІКТАРА МАРЦІНОВІЧА “СФАГНУМ”

В статье рассматривается авторская интерпретация архетипа болота в романе Виктора Мартиновича «Сфагнум», отмечается его тесная связь с белорусской литературной традицией и национальными белорусскими мифопоэтическими представлениями.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

The article reviews the author's interpretation of the swamp archetype and indicates its close connection with the Belarusian literary tradition and national Belarusian mythopoetic ideas (in the novel by Victor Martinovich «Sphagnum»).

Ключевые слова: белорусская литература, Виктор Мартинович, национальное и региональное, литературная аллюзия, замкнутый хронотоп, архетип болота, мифологизм.

Key words: Belarusian literature, Victor Martinovich, national and regional, literary allusion, closed chronotope, swamp archetype, mythology.

Віктар Марціновіч сваёй творчасцю працягвае традыцыю двухмоўнасці беларускай літаратуры: кожны цотны раман ён піша па-беларуску, а няцотны па-руску. Як патлумачыў гэты прыём аўтар, "мне здаецца, гэта адзіны спосаб дагрукацца да земляка-чытача, з яго моўным, платформавым і светапоглядным расколам суб'екта" [1]. Пісьменнік надзяляе ўласны білінгвізм кансалідуючай функцыяй, імкненнем у наяўных палітычных і культурных рэаліях уздзейнічаць на нацыянальную свядомасць, якая ў большасці па-ранейшаму знаходзіцца ў стане летаргіі. Трэці па ліку, рускамоўны раман "Сфагнум" выйшаў у 2013 годзе адразу ў двух варыянтах – у электронным выглядзе на мове арыгінала і ў папяровым выданні ў перакладзе на беларускую Віталя Рыжкова. Аўтар імкнецца да ўніверсалізму, да шырокай і разнапланавай чытацкай аўдыторыі, дзеля цікавасці якой тут і дынамічны сюжэт, і нетыповыя для беларускай літаратуры героі – тры маладыя гопнікі. Яны забіваюць падзельніка, які ўцёк з грашыма мафіі, і цяпер, ратуючыся і ад крыміналу, і ад міліцыі, вымушаны залегчы на дно і хавацца ў закінутай вёсачцы Гута Глускага раёна. Тут маладзёнам прыходзіць у галаву знайсці які-небудзь схаваны скарб і такім чынам вярнуць згубленыя грошы. Невыпадкова некаторыя даследчыкі вызначылі жанр рамана як гангстэрска-містычную трагікамедыю, "своеасаблівыя «Карты, грошы, два ствалы» ў беларускай правінцыі". Пры ўсёй яўнай забаўляльнасці твор утрымлівае ў сваёй мастацкай тканіне шматлікія алюзіі на нацыянальную класіку, перадусім на А. Міцкевіча, Я. Баршчэўскага, М. Гарэцкага з яго пошукамі "патаемна-беларускага", творчую гульню з нацыянальным архетыпам балота і рэаліямі замкнёнага палескага топаса.

У інтэрв'ю "Нашай Ніве" пісьменнік вызначыў месца свайго твора ў кантэксце беларускай літаратуры наступным чынам: "Па сутнасці, мой новы раман – «Людзі на балоце-3», бо першых людзей на балоце напісаў Мележ, другіх – Караткевіч у «Дзікім паляванні»". Я вырашыў вярнуцца да тэмы, трымаючы ў галаве тое, што балота і Беларусь – гэта вельмі блізкія з'явы" [1]. Сапраўды, алюзіі на "Палескую хроніку" відавочныя. І. Мележ не толькі ва ўсёй паўнаце і цэласнасці аднавіў традыцыйны свет Палесся, жыццё вяскоўцаў у гарманічным сужыцці з прыродным атачэннем, але і

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

паказаў пачатак разбурэння гэтага ўладкаванага сялянскага свету. Пабудова грэблі звязала куранёўцаў з цывілізацыяй, але прынесла непапраўныя страты. Па гэтай грэблі прыйшлі міканоры, башлыковы, дубадзелы, якія распачалі грамадска-палітычныя і сацыяльныя эксперыменты, павялі наступ на аўтэнтычную культуру палешукоў з устойлівымі нормамі ўзаемаадносін чалавека і прыроды, на стагоддзямі выпрацаваны лад жыцця. І. Мележ паказаў, як сацыяльны гвалт над сялянамі пераходзіць у маральна-этычную плоскасць, выклікае крызіс духоўнага жыцця палешукоў, запускае працэсы агульнай дэградацыі, вынікам якой урэшце рэшт праз некалькі пакаленняў сталіся героі-гопнікі рамана "Сфагнум", маладыя хлопцы з завадскіх ускраін, адарваныя ад сваіх каранёў дзеці ўчарашніх вяскоўцаў. Сацыяльны гвалт нарадзіў сацыяльнае балота, і беларускі прыродны ландшафт падаецца своеасаблівым сінонімам сучаснага беларускага сацыяльнага ландшафту.

В. Марціновіч разнапланава выкарыстоўвае нацыянальны архетып балота, якое пэўным чынам зліваецца з беларускай ідэнтычнасцю. Мастацкая літаратура традыцыйна звяртаецца да тэмы балота і беларусаў як людзей на балоце, калі імкнецца канцэптуальна патлумачыць спецыфіку беларускай гісторыі, грамадства, культуры, сам "дух нацыі". Даследчыкі разглядаюць балота як структураўтваральны элемент калектыўнага падсвядомага, называюць балота своеасаблівым кодам, з дапамогай якога можна зразумець спецыфіку беларускага менталітэту, размытасць і неакрэсленасць нацыянальнага характару, яго інтравертнасць і ірацыяналізм. Актуалізацыя нацыянальнага архетыпа балота ў рамане В. Марціновіча пралягае ў розных плоскасцях – сацыяльнай, міфалагічнай, філасофскай.

В. Марціновіч падкрэсліваў, што твор адрасаваны перадусім беларусам, таму што беларусы пабачаць там усё тое, што не пабачаць расіяне. Пісьменнік паказвае балота як трансцэндэнтную прастору, у якой свае насельнікі: вядзьмак, яго сябрукі-крумкачы, а недзе ў цэнтры, у бяздонным возеры, атабарыўся цмок, чыю прысутнасць хлопцы, пятляючы па балоце, увесь час адчуваюць. Як балота ўтрымлівае ў сябе архетып глыбіні, так і ў свядомасці мясцовых жыхароў прысутнічае вертыкаль, якая вядзе да захавання пракаветных, сакральных уяўленняў пра свет. Гарадскім хлопцам-прыхадням неверагоднымі падаюцца старажытныя замовы, галашэнні, наяўнасць цмока, які носіць золата і раняе яго ў балота, сапраўдных жанчынхы-русалак, легендарнага каўтуна, зачараваных скарбаў, – усе гэтыя элементы протакультуры, з якімі ім даводзіцца сустракацца ў правінцыі.

Разважанні над назвай твора паступова пераводзіць гаворку на філасофскі ўзровень. Сфагнум – першаэлемент балота і па-сутнасці ўсё ба-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лота – суцэльны сфагнум, толькі ў розных стадыях існавання: *“Тут з яго ўсё складаецца, гляньце пад ногі: купіны, торф пад нагамі – усё сфагнум. Купіна – жывы сфагнум, торф – перагнілы. Вадзіца гэта чорная – таксама сфагнум у рознай ступені раскладання… Сфагнум – лекі, сфагнум – паветра, сфагнум – агонь, сфагнум – зямля пад нагамі”, – кажа тутэйшы жыхар* [2, с. 221–222]. Так у раман уваходзіць універсальны матыў бясконцага пераўтварэння, захавання балансу і раўнавагі свету. Усе, што калісьці жыло і існавала, немінуча раскладаецца на першаэлементы – аснову далейшых пераўтварэнняў. Думка, што ўсё існуючае мае шанец потым паўтарыцца ў новым абліччы і новай якасці, вяртае да міфалагічных поглядаў на балота як першаматэрыял, з якога створаны навакольны свет. Матыў пераўтварэння спалучаецца з матывам пераходу. “Сабраўся ў дарогу”, так у вёсцы гавораць пра тых, хто сабраўся адыходзіць з гэтага свету. Смерць як пераўтварэнне, пераход з аднаго стану ў іншы з’яўляецца неабходным механізмам вечнасці. Такім чынам, балота ў рамане ўспрымаецца як увасабленне законаў вечнабыту.

Спрадвечнае, “патаемна-беларускае”, пра што пісаў М. Гарэцкі, а таксама глыбінная мудрасць балота выразна кантрастуе з дэградаваным сацыяльным жыццём. Аўтару спатрэбіліся прыёмы абсурдысцкай эстэтыкі, каб апісаць беларускую правінцыю на ўскрайку Палесся з прадажнымі чыноўнікамі і міліцыянтамі, вясковымі алкаголікамі, сваімі і заезджымі гопнікамі. Калісьці шматлюдная працавітая вёска Гута падаецца вёскай-прывідам з разбураным клубам, разваленым будынкам бібліятэкі, кінутымі дамамі з пустымі буслянкамі на стрэхах, адзінокімі постацямі рэдкіх насельнікаў. Адметна тое, што Шульга, адзін з найбольш падрабязна выпісаных аўтарам герояў, прывёўшы на схоў у дзедаву хату сваіх сяброў, “перамяніўся і выглядаў цяпер не на мазурыка-пачаткоўца з няўцямным мінулым і яшчэ менш уцямнай будучыняй, а на маладога гаспадара, чалавека зямлі, душэўнага хлопца”. З гонарам ён кажа: *“Ну так, гэта мая зямля”* [2, с. 46-47]. Тужліва гучыць матыў альтэрнатыўнасці лёсу Шульгі. Каб не башлыковы, дубадзелы ды іншыя – лёс хлопца імаверна склаўся бы не так абсурдна і бязладна. Адчуванне, што ўсё ў жыцці не так, вярэдзіць душу Шульгі. У рамане закладзены матыў магчымага вяртання, шанц, які аўтару хочацца пакінуць сваім героям. Некалькі разоў рытмічна паўтараецца адна і тая ж настальгічная дэталь: дзверы вясковых дамоў зачыненыя не на замок, а на клямку. Па вясковых звычаях гэта азначае, што *“гаспадара дома няма, але ён недзе паблізу. Яго можна даклікацца, калі пакрычаць як след”* [2, с. 304].

Месца дзеяння Марціновіч выбраў невыпадкова: сама назва горада, Глуск, асацыіруецца з глушшу і маргінальнасцю. У рамане Глуцск хутчэй

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

звязаны не з рэальным геаграфічным прататыпам, а ўвасабляе ўмоўную інтравертную прастору, замкнёны топас. Апісаныя ў рамане дарогі бязлюдныя, мёртвыя і паціху зарастаць травой. Рэйсавы аўтобус з вёскі Гута ў горад падаецца героям прывідам, які "матэрыялізуецца з туману без усялякага гуку", звычайную папутку ў суседнюю вёску трэба чакаць гадзінамі.

Замкнёная правінцыя, нібы багна, засмоктвае ў сябе, паглынае і кансервуе. Так, рэдактар мясцовай газеты прыехаў сюды па размеркаванні на два гады і незаўважна для сябе затрымаўся на 30 год. У тутэйшых жыхароў свой космас, завязаны на змену пор года, таму рэйтынг газеты трымаецца не на дзяжурных артыкулах пра працоўныя будні, а выключна на тэлепраграме і на народных прыкметах, забабонах і рэцэптах бытавой магіі. Глускі раён нагадвае чорную дзірку, дзе час дэфармаваўся, як і сама свядомасць мясцовых людзей. Своеасаблівым сімвалам замкнёнасці, бесперспектыўнасці і што самае істотнае, немагчымасці вырвацца з абдымкаў горада, нібы нейкай вязкай прасторы, у канцы рамана паўстае вобраз мёртвай аўтастанцыі. Разбіты гадзіннік на аўтастанцыі сведчыць, што сувязь са светам – зусім не актуальная рэч для жыхароў: *"Вецер бязвольна матляў уваходныя дзверы і кідаў прагаршчы пылу ў цыферблат вялікага квадратнага гадзінніка, які спыніўся назаўжды дзесяць гадоў ці дзесяць хвілін таму: часу для яго ўжо не існавала, як не існуе часу для трупа, вады ці шкілета згнілай машыны"* [2, с. 316]. Горад так і не выпускае са сваёй пасткі Шульгу, як і абодвух яго сяброў тым ці іншым чынам праглынула, нібы сапраўдная дрыгва, глухая правінцыя са сваімі законамі светаўладкавання, супраць якіх усе высілкі маладзёнаў падаюцца слабымі і недарэчнамі.

Аналіз ідэйна-тэматычнай і вобразнай спецыфікі рамана В. Марціновіча дае падставу сцвярджаць, што як двухмоўны пісьменнік ён рухаецца ў напрамку да нацыянальна-адметнага, беларускага, і гэты нацыянальны складнік з кожным творам набірае ўсё большую вагу. Пры гэтым нацыянальнае атрымліваецца сугучным агульначалавечым праблемам, што забяспечвае цікавасць да яго твораў як айчыннага, так і замежнага чытача.

Літаратура

1. Марціновіч, В. Мой новы раман – «Людзі на балоце-3» [Электронны рэсурс] / В. Марціновіч // Наша Ніва. – 2014. – Рэжым доступу : http nn.byc=ar&i=110414. – Дата доступу : 31.03.14.

2. Марціновіч, В. Сфагнум : раман / В. Марціновіч ; пер. В. Рыжкова. – Мінск : Кнігазбор, 2013. – 320 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова